***А. А. Макарава,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*загадчык кафедры менеджменту*
*сацыяльна-культурнай дзейнасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# КЛУБНЫЯ ЎСТАНОВЫ БЕЛАРУСІ Ў ЛЮСТЭРКУ ГІСТАРЫЧНЫХ ПАДЗЕЙ ПАЧАТКУ XX ст.

Аналіз матэрыялаў даследаванняў беларускіх вучоных М. А. Бяспалай [2, 4, 5], В. А. Каспяровіча і Г. І. Каспяровіч [7, с. 65], Л. М. Лыча і У. І. Навіцкага [14], Р. Я. Рухаўца, І. Ю. Ганчарова [16] дазваляе сцвярджаць, што дзейнасць устаноў культуры клубнага тыпу з самага пачатку свайго функцыянавання ў межах савецкага грамадства была цесна звязана з задачамі ідэйна-палітычнага выхавання народных мас [10, с. 48]. Адразу пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі актыўнае развіццё атрымалі такія культурна-асветніцкія ўстановы, як народныя дамы, клубы, бібліятэкі, хаты-чытальні. Расійскія даследчыкі адзначаюць, што ў канцы 1920 г. на прасторы савецкай Расіі працавала пяць тысяч народных дамоў і каля пяці тысяч розных клубных устаноў [15, с. 16].

Сетка ўстаноў культуры клубнага тыпу за першыя дзесяцігоддзі савецкай улады значна павялічылася, набыла структурны выгляд і паступова замацоўвалася як сістэма ідэйнага выхавання. Можна заўважыць, што арганізацыйна-тэарэтычныя падыходы да кіравання сферай сацыяльна-культурнай дзейнасці былі яшчэ не цалкам ідэалагізаваны. У першых артыкулах па праблемах культурнага жыцця і клубнай дзейнасці, выдадзеных адразу пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, адзначаецца, што «клуб – гэта жывая майстэрня, дзе ў непасрэдных зносінах паміж асобамі рэалізуецца патрэба ў творчасці, самарэалізацыі, дзе праз аматарскую дзейнасць чалавек далучаецца да эстэтычных каштоўнасцей».

Менавіта так характарызуе клуб адзін з расійскіх аўтараў таго часу В. Баровіч [3, с. 16]. На яго думку, рабочы клуб – «грамадскае прыстанішча, месца адпачынку пасля працы і зносін з сябрамі і прыяцелямі» [3, с. 19]. У распрацоўках гэтага аўтара

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўвага надаецца неабходнасці вырашэння пытанняў аб змястоўнасці выкарыстання вольнага часу працоўнымі масамі.

Звяртаючыся да гісторыі стварэння клубных устаноў, у першую чаргу можна адзначыць, што яны фарміраваліся як дэмакратычная самаарганізацыя людзей дзеля іх творчага самавыяўлення і сацыяльнай самарэалізацыі. Статус і напрамкі дзейнасці клубаў вызначаліся толькі праўленнем ці грамадскім саветам, выбраным дэмакратычным шляхам з удзелам усяго насельніцтва рэгіёна. Гэта самастойнасць і была своеасаблівым ключом, здольным завесці механізм творчай клубнай работы, заснаванай на міжасобасных зносінах.

Адзначым, што ў першыя гады пасля кастрычніцкіх падзей само паняцце «клуб» разглядаецца, у асноўным, у значэнні еднасці людзей, супольнасці, аб’яднання на аснове агульных інтарэсаў [8, с. 24]. Н. К. Крупская пісала, што па сваёй сутнасці клуб – гэта аб’яднанне групы людзей для той ці іншай мэты, прычым не толькі для адпачынку, але і для пазнавальна-творчай дзейнасці [11, с. 7–12].

Сучасныя тэарэтыкі аднадушныя ў тым, што менавіта Н. К. Крупская адыграла рашаючую ролю ў распрацоўцы ідэалагічных прынцыпаў культурна-асветніцкай работы і ў справе яе агульнадзяржаўнай арганізацыі. Яна неаднаразова падкрэслівала палітычны характар дзейнасці ўстаноў культуры [11; 12; 13]. «Хаты-чытальні, дамы культуры, бібліятэкі, школы, краязнаўчая, экскурсійная работа – усе гэтыя ўчасткі культработы, – пісала Н. К. Крупская, – павінны быць пранізаны духам марксізма-ленінізма, арыентавацца на бягучыя задачы сацбудаўніцтва» [12, с. 151].

Па некаторых архіўных даных з гісторыі станаўлення клубных устаноў у Беларусі вядома, што да Кастрычніцкай рэвалюцыі тут функцыянавала каля 237 клубаў, на кожны з іх прыпадала каля 80 тыс. жыхароў [9]. Даследчыкі Р. Я. Рухавец і І. Ю. Ганчароў між тым адзначаюць, у 1914 г. у Беларусі не было ніводнай клубнай установы на 30 тыс. населеных пунктаў [16, с. 12]. Культурна-асветніцкую і арганізацыйна-творчую дзейнасць ажыццяўлялі розныя грамадскія арганізацыі і таварыствы, асабліва ў вялікіх гарадах краіны [2, с. 109–112].

Менавіта ў 1920-я гг. паўсюдна на тэрыторыі Беларусі актыўна разгортваецца дзейнасць культурна-асветных устаноў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларускія гісторыкі М. А. Бяспалая, Л. М. Лыч і У. І. Навіцкі, Р. Я. Рухавец і І. Ю. Ганчароў сцвярджаюць, што найбольш распаўсюджаным тыпам клубнай установы і актыўным цэнтрам палітычнай і культурна-асветніцкай работы беларускай вёскі з'яўляліся хаты-чытальні.

Зыходзячы з задач ідэйна-палітычнага выхавання народных мас, яшчэ на прыканцы 1918 г. НКП РСФСР асігнаваў 10 млн руб. на культурныя патрэбы Беларусі, што паспрыяла ўтварэнню клубных структур у гарадах і вёсках краіны [16, с. 15]. З 1919 г. пачынаецца актыўная дзейнасць па адкрыцці Дамоў асветы, рабочых клубаў і хат-чытальняў, у Віцебску распачынаецца падрыхтоўка першых інструктараў для апошніх.

Цэнтралізацыя ўсёй палітыка-асветнай работы ў Беларусі пачалася яшчэ ў 20-я гг. мінулага стагоддзя, ад моманту стварэння Галоўпалітпрасвета пры Наркамасветы БССР. Паўсюдна ў раёнах ствараліся палітыка-асветныя камітэты, якія ўзначальвалі, галоўным чынам, упаўнаважаныя па народнай адукацыі [14, с. 296]. Р. Я. Рухавец і І. Ю. Ганчароў на аснове архіўных даных сцвярджаюць, што ужо ў 1921 г. у Беларусі было 24 прафсаюзных клуба і 136 клубаў, створаных па лініі Галоўпалітпрасвета [16, с.15].

Гісторыкі паказваюць розныя лічбы, якія характарызуюць колькасць розных клубных структур у гэты час, але пагаджаюцца ў адным: культурнае будаўніцтва ажыццяўлялася вельмі актыўна, хутка пашыралася сетка ўстаноў культуры, мэты і задачы культурнай рэвалюцыі цалкам вызначалі сутнасць і змест іх дзейнасці [16, с. 21–22]. Па архіўных даных можна меркаваць, што палітыка-масавая і культурна-асветная дзейнасць праводзілася дастаткова актыўна па краіне. Ужо ў 1926–1927 гг. функцыянавала 587 хат-чытальняў і 1082 чырвоных куткоў [16, с. 21–22], 95 народных дамоў [14, с. 296]. Асноўным відам палітыка-культурных устаноў у горадзе з'яўляліся клубы, прычым клубы першага і другога разрадаў знаходзіліся ў акружных цэнтрах, а трэцяга – у былых павятовых гарадах і пасёлках гарадскога тыпу. Тут праводзіліся гучныя чыткі газет і часопісаў, арганізоўваліся палітычныя гутаркі, ствараліся гурткі мастацкай самадзейнасці [14, с. 297]. Найбольш распаўсюджанымі былі драматычныя, харавыя, музычныя гурткі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Толькі ў сельскай мясцовасці ў 1926–1927 гг. працавала 125 клубаў і раённых дамоў сацыялістычнай культуры, 578 хатчытальняў. Даследчыкі Л. М. Лыч і У. Навіцкі сведчаць, што вельмі важнае месца ў павышэнні культурнага ўзроўню людзей, фарміраванні іх светапогляду надавалася таксама бібліятэкам. Калі ў 1925 г. іх было 376 з кніжным фондам больш мільёна тамоў, то ў 1929 г. іх налічвалася 6313 з фондам 1,5 млн. кніг [14, с. 296].

Нягледзячы на складанасць эканамічных умоў пасля Грамадзянскай вайны, выпрабаванні перыяду НЭПа, калі культасветустановы перавялі з дзяржаўнага на мясцовы бюджэт, сетка ўстаноў культуры развівалася, усё больш адпавядаючы мэтам палітычнага асветніцтва [16, с. 26].

Увогуле, у канцы 1928 г., як адзначае вядомы даследчык шляхоў развіцця беларускай вёскі ў 20-я гг. мінулага стагоддзя М. А. Бяспалая, «праявілася некаторая стабілізацыя сістэмы культасветустаноў, паступова пачало паляпшацца іх матэрыяльнае становішча, прымаліся меры па рашэнню кадравых праблем. У асноўным былі выпрацаваны формы і метады асветніцкай працы на вёсцы». Вучоны дапускае, што «хатачытальня паступова стала б цэнтрам культурнай жыцця вескі, калі б не былі прыняты рашучыя меры па калектывізацыі. Замацаванне савецкай ідэалогіі праз калектывізацыю прывяло да нечаканых і негатыўных змен у стане культурна-асветніцкай работы» [5, с. 9].

Можна пагадзіцца з меркаваннем аўтараў манаграфіі «Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі», якія лічаць, што ўстановы культуры на вёсцы ніколі не маглі задавальняць патрабаванні сельскіх жыхароў. «Справа ў тым, што беларуская вёска мела свой своеасаблівы лад жыцця, які грунтаваўся на спрадвечных традыцыях, звычаях, святах і абрадах, этычных і эстэтычных поглядах народа» [7, с. 185].

Нельга не прызнаць, што клубныя ўстановы адыгралі ў 20–30-я гг. мінулага стагоддзя сваю станоўчую ролю ў ліквідаванні непісьменнасці. Шматлікія «культпаходы», «культэстафеты», «культмаршруты» галоўнай сваёй мэтай ставілі барацьбу за пісьменнасць і асветніцтва ў шырокім яго разуменні. Пры клубных установах ствараліся «школы для непісьменных», якія ахоплівалі значную частку насельніцтва. Больш за 4 тыс. гурт-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

коў ажыццяўлялі адукацыйную работу сярод 75 тыс. непісьменных, а гэта 35 % ад агульнай колькасці ліквідаваўшых непісьменнасць у канцы 20-х гг. [16, с. 37].

Матэрыялы з архіва Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці даюць інфармацыю аб тым, што ў пачатку 30-х гг. наМіншчыне існавалі 132 клубныя структуры, якія даволі плённа працавалі па арганізацыі палітыка-масавых мерапрыемстваў. Нельга не прызнаць, што ў гэты ж час актыўна развіваецца самадзейная мастацкай творчасць самых розных відаў і жанраў. Шматлікія самадзейныя мастацкія калектывы ажыццяўляюць канцэртную дзейнасць, актыўна ўдзельнічаюць у першых алімпіядах самадзейнай мастацкай творчасці [1, с. 514–519].

Можна вызначыць, што дзейнасць клубных установ на Беларусі была дастаткова разгорнутай і адначасова палітычна рэгламентаванай. Аналіз літаратурных крыніц пацвярджае наяўнасць паслядоўнай дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да клубнай ўстановы як цэнтра ідэйна-палітычнага выхавання грамадства, што канчаткова склалася ў 30-я гг. мінулага стагоддзя.


*1.* Белорусская ССР: краткая энциклопедия : в 5 т. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелСЭ им. П. Бровки, 1981. – Т. 4 : Население; Язык; Этнография; Фольклор; Литература; Искусство; Архитектура. – 712 с.

*2. Беспалая, М. А.* О деятельности Минского общества любителей изящных искусств (1898–1906 гг.) / М. А. Беспалая // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. – Минск, 1985. – Вып. 4. – С. 109–112.

*3. Борович, В.* Рабочие клубы, их организация и ведение / В. Борович. – Харьков: Культурно-просветительная организация «Труд», 1919. – 106 с.

*4. Бяспалая, М. А.* Палітычнае асветніцтва 20-х гадоў у беларускай весцы як адыход ад асветніцкіх традыцый славянства / М. А. Бяспалая // IV Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры : матэрыялы чытанняў (Мінск, 24–26 мая 1998 г.). – Мінск,1999. – Ч. 2. – С. 134–137.

*5. Бяспалая, М. А.* Уплыў сацыяльна-палітычных абставін на культурна-асветніцкае жыццё вёскі ў другой палове 20-х гадоў / М. А. Бяспалая // Актуальныя праблемы і навуковыя пошукі ў галіне культуры і мастацтва : тэз. дакл. навук.-творч. канф. (Мінск, 19–20 крас. 1994 г.). – Мінск, 1994. – С. 9.

*6.* Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі / В. К. Бандарчык, В. М. Бялявіна, С. М. Мілючэнкаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 248 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*7.* Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 256 с.

*8. Зеленко, В.* Как устроить политический клуб / В. Зеленко. – М. : [Б. и.], 1917. – 88 с.

*9. Іванова, С. С.* Народная творчасць Міншчыны: гісторыя і сучаснасць / С. С. Іванова. – Мінск : Хата, 2000. – 158 с.

*10.* Клубоведение : учеб. пособие / под ред. В. А. Ковшарова [и др.]. – М. : Просвещение, 1972. – 318 с.

*11. Крупская, Н. К.* Чем должен быть рабочий клуб // Пед. соч. : в 10 т. – М., 1960. – Т. 8. – С. 7–12.

*12. Крупская, Н. К.* Основные типы политпросветучреждений // Пед. соч. : в 10 т. – М., 1960. – Т. 7. – С. 152.

*13. Крупская, Н. К.* Что такое клуб / Н. К. Крупская // Пед. соч. : в 10 т. – М., 1960. – Т. 8. – С. 17–18.

*14. Лыч, Л.* Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – 2–е выд., дап. – Мінск : Экаперспектыва, 1997. – 486 с.

*15.* Организация и методика клубной работы : учеб. пособие / под ред. Е. А. Зазерского, А. Г. Соломоника. – М. : Просвещение, 1975. – 335 с.

*16. Руховец, Г. Е.* Становление культурно-просветительской работы в Белоруссии : учеб.-метод. пособие / Г. Е. Руховец, И. Ю. Гончаров. – Минск : Минский пед. ин-т, 1976. – 51 с.

***И. В. Морозов,***
*доктор культурологии, профессор,*
*профессор кафедры менеджмента*
*социально-культурной деятельности*
*Белорусского государственного*
*университета культуры и искусств*

# ЗОДЧЕСТВО: ПРИЗВАНИЕ МИФОТВОРЦА

В современном понимании в мифе видится отнюдь не «детская» выдумка, не наивность человечества, но мудрые ответы на самые сокровенные вопросы жизнепонимания. Отсюда и зодчество предстает как мифотворчество, исконно создаваемое человеком-мифотворцем и рефлексивно творившее его самого. Всякая неодушевленная вещь или явление, если их брать не как предметы абстрактные, но как творение живого человеческого опыта, обязательно «суть мифы» [1]. Зодчество же, во всей своей миропреобразующей полноте и идейно-материаль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ